*ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК*

# СЯРГЕЙ ЛІНГ НАЗНАЧАНЫ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ



19 лютага Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь разглядала пытанне аб дачы сваёй згоды на назначэнне кіраўніком дзяржавы прэм'ер-міністра. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прадставіў для зацвярджэння парламентарыям кандыдатуру Сяргея Лінга, які дагэтуль выконваў абавязкі кіраўніка ўрада, пасля таго як перад рэферэндумам у адстаўку пайшоў Міхаіл Чыгір. А. Лукашэнка станоўча ахарактарызаваў перад дэпутатамі Сяргея Лінга, падкрэсліўшы, што спыніўся ён на гэтай кандыдатуры, зыходзячы з крытэрыяў сумленнасці і прыстойнасці. А. Лукашэнка зазначыў, што ён ужо «апаліўся» на адным прэм'еры, маючы на ўвазе М.Чыгіра, і не хацеў бы асабіста кантраляваць работу прэм'ера. «Калі правал у адным, падман у другім, калі проста непрыстойнасць, то даводзіцца ўмешвацца ў работу ўрада»,— падкрэсліў А. Лукашэнка. Яшчэ адным матывам для назначэння менавіта С.Лінга было тое, што Прэзідэнт лічыць прыярытэтам эканоміку, а Сяргей Сцяпанавіч з'яўляецца вопытным спецыялістам у гэтай сферы. Было падкрэслена, што ўрад цяпер мае больш паўнамоцтваў, ён кіруе выканаўчай «вертыкаллю», а Прэзідэнт застаецца як бы «рэжысёрам і арбітрам над галінамі ўлады».

З кароткай прамовай перад дэпутатамі выступіў і С.Лінг. Ён зазначыў, што разумее тую адказнасць, якая ўскладаецца на яго ў сувязі з крызісным станам эканомікі, і выказаўся па асобных праблемах. Па-першае, ён прызнаў справядлівай крытыку за празмерную інфляцыю, дапушчаную за апошнія месяцы. У снежні цэны павялічылася на 7,4 працэнта, у студзені — на 13,3, у першай дэкадзе лютага — на 6,7 працэнта. Гэта больш, чым прадугледжвалася. С. Лінг лічыць гэта непазбежным, бо за мінулы год усе жывёлагадоўля, а таксама вытворчасць масавых гатункаў хлеба былі стратнымі, цэны на іх стрымліваліся, акрамя таго, адбылася дэвальвацыя рубля, пацягнулі інфляцыю і не падмацаваныя таварнай масай крэдыты... Але С.Лінг упэўнены, што ўрад здолее справіцца з інфляцыяй.

Па-другое, сур'ёзнай праблемай Сяргей Сцяпанавіч назваў неплацяжы, якія складаюць цяпер 80 трыльёнаў па дэбіторскай запазычанасці і 100 – па крэдыторскай. «Мы можам патануць у гэтым моры неплацяжоў»,— падкрэсліў ён. Па-трэцяе, С.Лінг зазначыў, што многія гаспадарчыя суб'екты дрэнна працуюць з-за безадказнасці і няўмення іх кіраўніцтва і паабяцаў заняцца павышэннем патрабавальнасці і ўмацаваннем дысцыпліны. «Эканоміка Беларусі і рэспубліка ў цэлым маюць вялікія перспектывы, у нас ёсць эканамічны патэнцыял, граматны народ, і я ўпэўнены, што рух наперад будзе»,— заявіў С.Лінг. Нейкіх новых ідэй эканамічных пераўтварэнняў у краіне не прагучала, магчыма, яны будуць у праграме новага ўрада, якую Сяргей Лінг паабяцаў падрыхтаваць у бліжэйшы час.

Дэпутат А.Красуцкі далажыў парламентарыям, што ўсе камісіі разгледзелі кандыдатуру С.Лінга і рэкамендуюць пагадзіцца з ёю. Вынікі тайнага галасавання былі наступнымі: 97 дэпутатаў падтрымалі кандыдатуру Сяргея Лінга і 8 выказаліся супраць. Такім чынам, нядаўна рэфарміраваны беларускі ўрад займеў паўнапраўнага прэм'ер-міністра.

Пасля гэтага другая нечарговая сесія Палаты прадстаўнікоў была афіцыйна закрыта, а чарговая сесія пачнецца 2 красавіка.

Тым не менш, на гэтым работа дэпутатаў не завяршылася. У 12 гадзін абедзве палаты Нацыянальнага сходу сабраліся на сумеснае пасяджэнне, якое было аб'яўлена закрытым. На ім з дзвюхгадзіннай прамовай выступіў кіраўнік дзяржавы. Як пазней расказаў прэс-сакратар Прэзідэнта Валерый Талкачоў, Аляксадр Лукашэнка выклаў на гэтым пасяджэнні сваё бачанне дзейнасці парламента, заявіўшы, што Нацыянальны сход павінен больш актыўна ўключацца ў працэс пераўтварэнняў у краіне, а таксама закрануў сельскую гаспадарку, цэнаўтварэнне, акцэнтаваў увагу на дысцыпліне і парадку ў краіне. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што Беларусь была і будзе незалежнай дзяржавай, але інтэграцыя з Расіяй будзе працягвацца. Прэзідэнт падкрэсліў, што рыхтуецца канцэпцыя развіцця Супольнасці Беларусі і Расіі, якая будзе разглядацца ў першай дэкадзе сакавіка на сумесным пасяджэнні расійскага і беларускага парламентаў. Аб падрабязнасцях В.Талкачоў не паведаміў, падкрэсліўшы, што А.Лукашэнка пакуль рыхтуецца да сустрэчы з Б.Ельцыным 7 сакавіка ў Маскве.

**Валер КАЛІНОЎСКІ.**